УДК 947.6«1941/1944»

# Жаночы склад партызанскіх фарміраванняў Беларусі ў 1941–1944 гг.: сацыяльна-дэмаграфічная характарыстыка

**І.У. Нікалаева**
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава"

*Мэтай даследавання з'явілася вывучэнне жаночага асабовага складу партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі на часова акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. Даследаванне ажыццяўлялася з прыцягненнем матэрыялаў кадравага характару па гісторыі партызанскага руху, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, а таксама ўжо апублікаванай у гістарычнай літаратуры статыстычнай інфармацыі.*

*На падставе вывучэння выніковай дакументацыі Беларускага штаба партызанскага руху і статыстычнай апрацоўкі імянных спісаў жаночага складу партызан з выкарыстаннем тэхналогіі базы даных прааналізавана спецыфіка і дынаміка фарміравання жаночых партызанскіх кадраў, прадстаўлена іх якасная характарыстыка па шэрагу паказчыкаў: узрост, нацыянальнасць, партыйнасць, сацыяльнае становішча да вайны.*

Вялікая Айчынная вайна паказала свету такі сацыяльна-псіхалагічны феномен, як масавы ўдзел савецкіх жанчын у абароне сваёй Айчыны. Тысячы патрыётак сталі актыўнымі ўдзельніцамі антыгерманскага супраціўлення на часова акупаванай тэрыторыі Беларусі, галоўнай і найбольш дзейснай формай якога з'явіўся партызанскі рух. Нягледзячы на тое, што за 65 гадоў пасля Перамогі даследчыкамі быў назапашаны значны фактычны матэрыял па пытаннях гераічнай барацьбы жанчын і дзяўчат у складзе атрадаў і брыгад беларускіх партызан, шматлікія айчынныя выданні па гісторыі антыгерманскай барацьбы ў Беларусі да гэтага часу ўтрымліваюць вельмі абмежаваную статыстычную інфармацыю, якая характарызуе ўдзел жанчын у партызанскім руху. Аналіз навуковай спадчыны, створанай савецкімі даследчыкамі, дае падставы для высновы, што нават фундаментальныя абагульняючыя працы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і антыгерманскага супраціўлення змяшчаюць толькі агульныя лічбы колькасці жанчын у працэнтных суадносінах з мужчынскім складам партызан, якія прадстаўлены ілюстратыўна, галоўным чынам, з мэтай пацвярджэння канцэпцыі ўсенароднага характару барацьбы на акупаванай тэрыторыі Беларусі [1–3]. Ідэалагізацыя даследаванняў па гісторыі партызанскага руху і працяглая закрытасць архіўных фондаў сталі асноўнымі прычынамі недастатковай вывучанасці асабовага складу партызан у цэлым і вызначылі гістарыяграфічную сітуацыю распрацоўкі праб-

***Адрес для корреспонденции:*** 210015, г. Витебск, пр. Московский, д. 42, кв. 92, тел.: 8(0212) 47-06-21, +37529 660-15-32 – Николаева И.В.

лемы жаночых партызанскіх кадраў. У 1990-я гады ў беларускім навуковым дыскурсе склаліся аб'ектыўныя ўмовы для аналізу дадзеных аспектаў з новых тэарэтыка-метадалагічных пазіцый. У святле праблемы заслугоўвае ўвагі даследаванне А.Я. Паўлавай, у якім аўтар упершыню паспрабавала прааналізаваць занатаваную ў імянных спісах сацыядэмаграфічную інфармацыю пра баявы склад партызанскіх фарміраванняў, у тым ліку жанчын, аднак крыніцазнаўча-метадалагічная накіраванасць працы не дазволіла зрабіць гэта больш дэталёва [4]. Між тым, зацвярджэнне ў сучаснай гістарычнай навуцы антрапалагічнай парадыгмы вызначае неабходнасць спецыяльнага адраснага даследавання колькасных і якасных характарыстык удзельніц узброенай барацьбы і іх дыферэнцыраванага аналізу. У гэтай сувязі аўтарам зроблена спроба прадставіць рэпрэзентатыўную карціну жаночых партызанскіх кадраў на падставе вывучэння выніковай дакументацыі Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) і статыстычнай апрацоўкі імянных спісаў жаночага складу партызан з выкарыстаннем тэхналогіі базы даных, прапанаванай А.Я. Паўлавай для аналізу асабовага складу партызанскіх фарміраванняў.

**Матэрыял і метады.** З мэтай ацэнкі сацыяльна-дэмаграфічных паказчыкаў жаночага асабовага складу партызанскіх брыгад і атрадаў аўтарам была створана электронная база даных (БД) на падставе 10% выбаркі з імянных спісаў жаночага асабовага складу партызанскіх фарміраванняў Віцебскай, Мінскай і Баранавіцкай абласцей (адпаведна даваеннаму тэрытарыяльна-адміністрацыйнаму падзелу), якія вызначаюцца найбольшай колькасцю жанчын-удзельніц партызанскага руху і адначасова прадстаўляюць цэнтральную, усходнюю і заходнюю часткі Беларусі[1]. Названыя дакументы, апрацаваныя з выкарыстаннем колькасных метадаў і інфармацыйных тэхналогій, дазволілі ацаніць якасныя характарыстыкі жаночых партызанскіх кадраў па шэрагу паказчыкаў: узрост, нацыянальнасць, партыйнасць, сацыяльная прыналежнасць і інш. Атрыманыя ў ходзе вывучэння БД статыстычныя даныя, параўнаныя і дапоўненыя інфармацыяй кадравага характару, апублікаванай у гістарычнай літаратуры, і ўпершыню ўведзенымі ў навуковы ўжытак матэрыяламі справаздачнай дакументацыі БШПР дазволілі не толькі прадставіць сацыяльна-дэмаграфічныя звесткі пра беларускіх партызанак, але і выявіць асноўныя тэндэнцыі фарміравання жаночага складу партызанскага руху, высветліць характар панесеных страт.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Для характарыстыкі асабовага складу беларускіх партызан сёння ў гістарычнай літаратуры выкарыстоўваецца інфармацыя, прадстаўленая ў «Даведцы аб колькасці партызан, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларускай ССР», састаўленай на аснове статыстычнай распрацоўкі аддзела кадраў БШПР на 1 жніўня 1946 г. У названую даведку ўключана 373 942 партызан, аднак лічбавыя даныя па палавых суадносінах прыводзяцца толькі на 282 458 чалавек, з якіх на жанчын прыходзіцца 16% (45 242 партызанкі). Менавіта гэта лічба ўсталявалася ў айчыннай савецкай гістарыяграфіі і па-ранейшаму выкарыстоўваецца сучаснымі даследчыкамі без удакладнення і каментарыяў таго факта, што вызначаная колькасць жанчын-

[1] База даных складзена на аснове матэрыялаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. – Фонд 3500. – Воп. 5. Списки личного состава партизанских бригад и отрядов, действовавших на территории БССР.

партызанак, акрамя непасрэдна ўваходзіўшых у асабовы склад партызанскіх фарміраванняў, уключае 16 800 агентурных разведчыкаў і 11 740 сувязных. Між тым, па даных згаданай распрацоўкі БШПР, сярод наяўнага баявога складу атрадаў і брыгад, якія прадставілі спісачную справаздачнасць на дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі, на долю жанчын прыходзілася 7,8% ці 15 304 чалавекі [5, арк. 9].

Дакументальныя крыніцы БШПР дазваляюць прааналізаваць дынаміку колькасці жаночага складу партызанскіх сіл Беларусі. Так, у партызанскіх фарміраваннях, звесткі пра якія былі прадстаўлены ў БШПР, знаходзілася: на снежань 1942 г. – 576 жанчын (5,3% ад асабовага складу партызан), на 1 студзеня 1943 г. – 1197 (5,8%), на ліпень 1943 г. – 3030 (6,7%) [6, арк. 49, 80; 7, арк. 135]. Такім чынам, бясспрэчны той факт, што большасць жаночага насельніцтва ўступіла на шлях узброенай барацьбы з акупантамі ў другой палове 1943–1944 гг.

Дынаміку ўступлення жанчын у рады партызан дае магчымасць прасачыць створаная намі БД жаночага асабовага складу партызанскіх фарміраванняў. Адпаведна БД, на працягу першага паўгода вайны партызанкамі сталі менш за 1% патрыётак, а колькасць жанчын, што ўступілі ў партызаны да ліпеня 1942 г., склала толькі каля 8%. У той жа час паток патрыётак, што ўступалі ў рады народных мсціўцаў да канца 1942 г., павялічыўся ў 2 разы, што адпаведна склала больш за 17% усіх партызанак. Асноўная маса жанчын уключылася ва ўзброеную барацьбу ў 1943–1944 гг. – 73,9% ад усіх патрыётак, прычым больш за палову з іх далучыліся да партызанскай барацьбы з ліпеня 1943 г. да пачатку 1944 г. За гэты прамежак часу ў працэнтных адносінах у рады народных мсціўцаў уступіла 37,8% усіх партызанак. Яшчэ каля 16% жанчын і дзяўчат сталі партызанамі на заключным этапе барацьбы (1944 г.).

Такім чынам, аналіз даных справаздач аддзела кадраў за разнастайныя перыяды вайны і вывучэнне асабовага складу Віцебскай, Мінскай і Баранавіцкай абласцей паказваюць, што жаночае насельніцтва пачало актыўна далучацца да партызанскай барацьбы з другой паловы 1942 г. Масавы прыток жанчын у партызанскі рух назіраецца з другой паловы 1943 г., што было цесна звязана з агульным ростам партызанскіх сіл і абумоўлена шэрагам прычын. Сярод іх, па-першае, агульны пад'ём арганізацыйнай работы партыйных падпольных органаў сярод жаночага насельніцтва ў тыле ворага; па-другое, значнае пашырэнне з другой паловы 1943 г. нацысцкай практыкі прымусовай мабілізацыі мясцовых жанчын на работы ў рэйх, што стала адным з фактараў, які спрыяў росту жаночых партызанскіх сіл. Вышэйшыя партыйныя органы з мэтай выратавання мясцовага насельніцтва абавязвалі кіраўніцтва партызанскіх фарміраванняў "безагаворачна прымаць у партызанскія атрады ўсіх жадаючых незалежна ад полу і ўзбраення" [8, арк. 47].

Аналіз імянных спісаў асабовага складу вывучаемых абласцей дазваляе прасачыць, якімі шляхамі жанчыны траплялі ў партызанскія атрады. Даныя БД указваюць на перавагу мясцовых жыхароў – 92,4%. Накіравана ў тыл было крыху больш за 1% удзельніц партызанскага руху. 4,3% партызанак уцяклі з варожага палону, лагераў, вырваліся з гета. Каля 1% жанчын і дзяўчат да ўступлення ў атрад працавалі ў нямецкіх установах і на прадпрыемствах на акупаванай тэрыторыі.

Архіўныя дакументы сведчаць, што на пачатак вызвалення Беларусі ад германскай акупацыі жанчыны прысутнічалі практычна ва ўсіх партызанскіх фарміраваннях і ў цэлым былі прадстаўлены ў іх важка. Так, у партызанскіх атрадах і брыгадах Брэсцкай вобласці, па даных на 1 верасня 1943 г., жанчыны складалі 11% ад агульнай колькасці партызан, у 48-мі атрадах Баранавіцкай вобласці на 1 кастрычніка 1943 г. – звыш 8%, у Магілёўскай на 1 снежня 1943 г. – звыш 6% [9, арк. 9; 10, арк. 44; 11, арк. 153].

Праведзены аналіз асабовага складу партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі ў розных рэгіёнах рэспублікі, дазваляе сцвярджаць, што жанчыны былі актыўнымі ўдзельніцамі партызанскай барацьбы ва ўсіх абласцях Беларусі – як усходняй, так і заходняй яе часткі. Некаторае ўяўленне пра гэта даюць прыведзеныя ніжэй фактычныя даныя, атрыманыя ў выніку асабістых падлікаў аўтара па даведніку "Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны" [12]. Так, у атрадах і брыгадах Віцебскай вобласці на дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі на долю жанчын прыходзілася 9,6% партызан, Беластоцкай – 9,4%. Жанчыны складалі звыш 8% партызан, якія дзейнічалі ў Баранавіцкай вобласці, 7,5% – у партызанскіх фарміраваннях Мінскай вобласці, 7,3% і 7,2% – сярод народных мсціўцаў адпаведна Вілейскай і Брэсцкай абласцей. Удзельная вага жанчын у асабовым складзе партызанскіх брыгад і атрадаў Гомельскай вобласці была 6,9%, Пінскай – 6,8%, Магілёўскай – 6,7%, Палескай – 6%. Пры гэтым у складзе разнастайных партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі на тэрыторыі адной вобласці, прадстаўніцтва, удзельная вага жанчын вар'іруецца і часта залежыць ад выпадковых фактараў. Так, на Віцебшчыне ў Багушэўскай брыгадзе другога складу жанчыны складалі каля 17%, а ў 2-й Дрысенскай толькі 3,5% ад агульнай колькасці партызан. У Палескай вобласці на долю жанчын прыходзілася 14,8% партызан асобнага атрада імя К.Я. Варашылава і 1,3% асабовага складу 101-й Даманавіцкай брыгады.

Звяртае на сябе ўвагу той факт, што значную колькасць сярод партызанак складалі жанчыны менавіта маладога ўзросту. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці, дзе на 1 красавіка 1943 г. налічвалася 548 партызанак, 305 з іх былі камсамолкамі [13, арк. 144], сярод 1230 жанчын, якія змагаліся ў атрадах і брыгадах вобласці, па даных на жнівень 1943 г., 596 складалі дзяўчаты менавіта камсамольскага ўзросту [14, с. 167]. На тое, што ў большасці сваёй у партызанскіх фарміраваннях змагаліся маладыя жанчыны, паказваюць таксама лічбы, атрыманыя намі ў ходзе вывучэння матэрыялаў створанай БД. Даныя спісаў асабовага складу партызанскіх фарміраванняў дазваляюць гаварыць, што на долю жаночай моладзі, якая на момант уступлення ў атрад не дасягнула 26-гадовага ўзросту, прыходзілася звыш 70% ад агульнай колькасці партызанак. Ва ўзроставых адносінах жанчыны-партызанкі, паводле статыстычнай распрацоўкі, размеркаваліся наступным чынам: малодшыя за 16 год – 2,9%; 16–18 год – 17,9; 19–20 год – 22,7; 21–25 год – 31,5; 26–30 год – 10,7; 31–35 год – 4,8; 36–40 год – 4,8; старэйшыя за 40 год – 4,4%. З прыведзенай вышэй інфармацыі бачна, што ў партызанскі рух уключалася найбольш актыўная і фізічна моцная частка жаночага насельніцтва. Дадзеныя абставіны тлумачацца як суровымі ўмовамі партызанскага жыцця, так і сітуацыяй на акупаванай тэрыторыі: менавіта гэта частка жаночага

насельніцтва Беларусі разглядалася гітлераўцамі як найбольш прыдатная для вярбоўкі на прымусовыя работы ў Германію, выратаваннем ад чаго для многіх маладых жанчын, як ужо адзначалася, станавілася ўступленне ў рады партызан.

Вывучэнне нацыянальнага складу партызанак паказала на перавагу сярод іх жанчын беларускай нацыянальнасці. Так, аналіз створанай аўтарам па матэрыялах імянных спісаў базы даных сведчыць, што тры чвэрці ад агульнай колькасці партызанак былі беларускамі. Сярод прадстаўніц іншых нацыянальнасцей, якія змагаліся ў радах партызан на беларускай тэрыторыі, галоўнае месца належыць рускім – 13,2%. Вывучэнне БД сведчыць пра ўдзел у партызанскім руху 7,4% яўрэек. Прычым, у Баранавіцкай вобласці доля апошніх была значна большай – 16,2% ад агульнай колькасці мясцовых партызанак. Прадстаўніцы іншых нацыянальнасцей склалі па трох абласцях 2,5%, гэта галоўным чынам украінкі і полькі.

Вынікі апрацоўкі інфармацыі імянных спісаў пацвярджаюцца матэрыяламі справаздачнай дакументацыі, якія захоўваюць адпаведную інфармацыю кадравага характару пра шэраг партызанскіх брыгад, што вялі барацьбу ў розных рэгіёнах рэспублікі. Так, у асабовым складзе брыгады імя Ф.Э. Дзяржынскага, што дзейнічала ў Баранавіцкай вобласці, за ўвесь час яе існавання налічвалася 43 жанчыны, з іх 25 беларусак, 7 рускіх, 5 украінак, 5 яўрэек [15, арк. 212]. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй з 104 жанчын-партызанак пінскай брыгады імя С.М. Будзённага 83 з'яўляліся беларускамі, 9 – рускімі, 7 – яўрэйкамі, 4 – украінкамі і 1 – полькай [16, арк. 138]. Сярод 50 партызанак, якія за ўвесь час змагаліся ў 2-й Беларускай брыгадзе імя П.К. Панамарэнкі (2-га складу) Віцебскай вобласці, налічвалася 40 беларусак, 9 рускіх і 1 жанчына латышскай нацыянальнасці [17, арк. 4–41]. З прыведзеных фактаў бачна, што ў нацыянальных адносінах асноўную масу партызанак Беларусі складалі беларускі, а таксама прадстаўнікі нацыянальных меншасцей, якія пражывалі тут у даваенны перыяд: рускія, яўрэі, украінцы.

Аналіз звестак пра партыйную прыналежнасць жаночага складу партызанскіх сіл паказаў, што большасць жанчын-партызанак былі беспартыйнымі. Апошнія склалі 62,5% ад тых, што трапілі ў выбарку. Гэта адпавядае даным штогадовых і выніковых падлікаў БШПР па партыйнасці беларускіх партызан абодвух палоў. Жанчын-кандыдатаў і членаў ВКП(б) у БД аказалася менш за 4%. Прыкладна трэць партызанак з'яўляліся членамі ВЛКСМ, што тлумачыцца значным прадстаўніцтвам у партызанскім руху Беларусі жанчын менавіта камсамольскага ўзросту.

Відавочна, што доля камуністак і камсамолак змяняецца ў групах у залежнасці ад пасады, якую партызанка займала ў атрадзе. Вывучэнне асабовага складу Віцебскай, Мінскай і Баранавіцкай абласцей паказвае на тое, што камуністамі і камсамолкамі з'яўлялася большасць прадстаўніц камандна-начальніцкага складу – 84,6%, у той час як радавымі байцамі было ўсяго крыху больш за 6% камуністак. Такая карціна дае падставу сцвярджаць, што размеркаванне пасад у партызанскім атрадзе знаходзілася пад уплывам партыйнага фактару, а партыя камуністаў, у сваю чаргу, адыгрывала кіруючую ролю ў партызанскім руху.

Атрыманыя ў ходзе вывучэння БД звесткі пра пасады, якія займалі партызанкі да вайны, сведчаць пра ўдзел у партызанскім руху самых шырокіх сацыяльных слаёў

жаночага насельніцтва. Каля трэці ўсіх жанчын складалі навучэнкі і студэнткі, што адпавядае ўзроставай структуры беларускіх партызанак у нашай выбарцы. Лічбавыя даныя пацвярджаюць значнае прадстаўніцтва ў баявым складзе атрадаў і брыгад сялянак і рабочых, на іх долю прыходзілася 32% усіх партызанак. Больш за 11% з'яўляліся да вайны служачымі і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі. Прыкладна аднолькавую колькасць у радах беларускіх партызанак (каля 8%) складалі жанчыны-настаўніцы і медыкі, абсалютную большасць сярод апошніх саставіў сярэдні медыцынскі персанал. Сярод патрыётак, якія змагаліся са зброяй у руках у партызанскіх атрадах і брыгадах Беларусі, налічвалася 4,7% хатніх гаспадынь. Рознага роду кіраўнікі склалі крыху больш за 2%. Такім чынам, нават такая невялікая БД паказвае на ўдзел у партызанскім руху жанчын і дзяўчат, якія з'яўляліся прадстаўніцамі ўсіх сфер чалавечай дзейнасці.

У барацьбе з акупантамі жанчыны праявілі масавы гераізм і мужнасць, як і іншыя ўдзельнікі антыгерманскай барацьбы, панеслі значныя страты. Паводле статыстычных даных БШПР, страты сярод жаночага складу партызанскіх фарміраванняў Беларусі склалі 1 398 чалавек, ці 3,1% ад агульнай колькасці страт беларускіх партызан. З іх больш 60% жанчын загінулі і памерлі ад ран, 30,7% прапалі без вестак, 0,6% партызанак трапілі ў палон, 6,5% выбылі з атрадаў і брыгад па іншых прычынах [5, арк. 9].

**Заключэнне.** Такім чынам, праведзены аналіз паказаў, што жаночае насельніцтва пачало актыўна далучацца да партызанскай барацьбы з другой паловы 1942 г., асноўная частка жанчын уступіла ў атрады ў 1943–1944 гг. Атрыманыя ў ходзе даследавання звесткі сведчаць пра малады ўзрост асноўнай часткі партызанак, сярод якіх колькасна пераважалі беларускі. Большасць патрыётак з'яўляліся беспартыйнымі, тады як сярод жанчын, прадстаўленых у кіруючых структурах падпольнай і партызанскай барацьбы, пераважалі камуністкі і камсамолкі. Вывучэнне сацыядэмаграфічнай інфармацыі ў цэлым дае падставы канстатаваць, што сярод патрыётак, якія ўключыліся ў партызанскую барацьбу супраць акупантаў, былі прадстаўніцы розных сацыяльных груп насельніцтва незалежна ад узросту, нацыянальнай прыналежнасці, партыйнасці і роду заняткаў у даваенны перыяд, што пацвярджае агульнапрыняты тэзіс пра ўсенародны характар антыгерманскай барацьбы на часова акупаванай тэрыторыі рэспублікі.

### Л і т а р а т у р а

1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыкл. / Беларус. сав. энцыкл.; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1990. – 680 с.
2. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: в 3 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; гл. ред. А.Т. Кузьмин (пред.) [и др.]. – Минск: Беларусь, 1983–1985. – Т. 1: 1941–1942. – 1983. – 591 с.; Т. 2: 1943. – 1984. – 551 с.; Т. 3: 1943–1944. – 1985. – 531 с.
3. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / Акад. навук БССР. Ін-т гісторыі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 4: Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.) / рэдкал.: І.М. Ігнаценка (старш.) [і інш.]. – 1975. – 640 с.

4. Павлова, Е.Я. Личный состав партизанских формирований Беларуси в годы Великой Отечественной войны (1941–1944 гг.): источники и методы исследования: автореф. ... дис. канд. ист. наук: 07.00.09 / Е.Я. Павлова; БГУ. – Минск, 2003. – 20 с.
5. Статистические разработки по отделу кадров БШПД // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 3500. – Воп. 12. – Спр. 10.
6. Справки, информации и сведения работников аппарата ЦК КП(б)Б о состоянии партийного подполья, количественном составе партийно-комсомольских организаций по партизанским отрядам Белоруссии 1942–1943 гг. // НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 33-а. – Спр. 248.
7. Материалы к истории партизанского движения в Белоруссии 1943 г. // НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 33-а. – Спр. 524.
8. Протоколы заседаний Могилевского обкома КП(б)Б 1943 г. // НАРБ. – Фонд 1350. – Воп. 1. – Спр. 16.
9. Докладная записка Барановичского подпольного обкома КП(б)Б в ЦК КП(б)Б “О состоянии партизанского движения и партийного подполья в Барановичской области на 1 октября 1943 г.” // НАРБ. – Фонд 1329. – Воп. 1. – Спр. 8.
10. Отчет, докладные записки, информации партийных организаций Брестской области о состоянии подпольной партийно-комсомольской работы 1942–1944 гг. // НАРБ. – Фонд 1333. – Воп. 1. – Спр. 3.
11. Протоколы заседаний бюро Могилевского обкома КП(б)Б 1942–1944 гг. // НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 33-а. – Спр. 280.
12. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): крат. сведения об орг. структуре партиз. соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / А.Л. Манаенков [и др.]. – Минск: Беларусь, 1983. – 765 с.
13. Материалы Могилевского обкома ЛКСМБ 1942–1943 гг. // НАРБ. – Фонд 63-п. – Воп. 16. – Спр. 11.
14. Каваленя, А.А. Падрыхтоўка партызанскай моладзі да ўзброенай барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі / А.А. Каваленя // Старонкі ваеннай гісторыі Беларусі: зб. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі, аддз. ваен. гіст., Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка, каф. айчын. і сусвет. гісторыі; навук. рэд. А.М. Літвін. – Мінск: БДПУ, 1998. – Вып. 2. – С. 157–171.
15. История бригады имени Ф.Э. Дзержинского Барановичской области 1942–1944 гг. // НАРБ. – Фонд 3500. – Воп. 4. – Спр. 255-а.
16. История бригады имени С.М. Буденного Пинской области 1941–1944 гг. // НАРБ. – Фонд 3500. – Воп. 4. – Спр. 280.
17. Списки личного состава 2-й Белорусской бригады имени П.К. Пономаренко (второго состава) Витебской области // НАРБ. – Фонд 3500. – Воп. 5. – Спр. 11.

*S U M M A R Y*

*The article deals with the analyses of personal female membership of partisan groups and brigades in the temporary occupation territory of Belarus in 1941–1944. On the basis of archive documents and public materials the author characterizes the specificity and the dynamics of its formation. The qualitative characteristic is made on a number of parameters: age, nationality, party membership, social status before the war, distribution of the posts in the groups.*

*Поступило 29.04.2010*